# Выстаўка ў бібліятэцы

МІНСК. У Беларускай дзяржаўнай бібліятэцы імя У. І. Леніна падрыхтавана выстаўка кніг і альбомаў, прысвечаная 50-годдзю з дня пабудовы ў нашай сталіцы Дома ўрада і помніка У. І. Леніну на плошчы імя правадыра.

Матэрыялы выстаўкі паведамляюць, як у 1929 годзе быў аб'яўлены конкурс на лепшыя праекты помніка і будынка. У ім удзельнічалі вядомыя архітэктары і скульптары краіны. Перамаглі ленінградцы — архітэктар І. Г. Лангбард і скульптар М. Г. Манізер.

У мастацкім афармленні Дома ўрада прынялі ўдзел такія вядомыя савецкія скульптары і мастакі, як І. Бродскі, З. Азгур, А. Бембель, А. Глебаў, А. Арлоў.

Выстаўка знаёміць таксама з шэрагам новых выданняў, прысвечаных архітэктуры Мінска.

Ю. САДОЎСКАЯ,
Я. САДОЎСКІ.